# ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКІХ ЛІТАРАТАРАЎ „ТУТЭЙШЫЯ” – 20 ГАДОЎ З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ

*Iwona MACHETA*
UMCS, Lublin

**Streszczenie**

TOWAŻYSTWO LITERATÓW BIAŁORUSKICH „TUTEJSYJA” – 20 LAT OD DNIA UTWORZENIA

W pracy została przedstawiona sytauacja lat ’80 XX wieku w litaraturze białoruskiej - tworzenie się nowych ugrupowań wśród młodych, początkujących twórców. Szczególne miejce w pracy, poświęcone jest opisaniu tworzenia się toważystwa literatów białoruskich „Tutejszyja”. Tytuł niniejszego referatu: „ Toważystwo literatów białoruskich „Tutejsyja” – 20 lat od dnia utworzenia”, ma za zadanie czytelnikowi przybliżyć tematykę owej pracy, w której na pierwszy plan wysuwa się opisanie powstawania toważystwa, wyliczenie członków, określenie celu ugrupowania i tematyki utworów młodych pisarzy, oraz tendencji jakie wnieśli swoją twórczością do literatury białoruskiej.

Другая палова 80-ых гадоў на Беларусі – гэта час актывізацыі культурных, грамадскіх, палітычных працэсаў. У гэты час складваецца новая літаратурная сітуацыя. Нам вядома, што Беларусь за час свайго існавання ўваходзіла ў склад розных дзяржаў з markdown рознымі ўладамі. Важнае значэнне мела хрысціянскае веравызнанне, талерантнасць, шматмоўнасць, а таксама размяшчэнне Беларусі паміж усходам і захадам. Гэтыя мінулыя падзеі мелі вялікі ўплыў на развіццё беларускай літаратуры, духоўнасці, культуры.

Да 1985 года найчасцей беларускія пісьменнікі розных пакаленняў пісалі пра стваральную працу народа, вялікую Перамогу, пра святкаванне яе 40-годдзя, асэнсоўвалі мінулае краю. Аднак ужо з 1986 года ключавымі паняццямі беларускай літаратурнай публіцыстыкі сталі: „час пераменаў” і „пара асэнсаванняў”. У гэты час актыўна працуюць такія майстры слова як: А. Адамовіч, В. Быкаў, Я. Брыль, В. Адамчык, С. Алексіевіч, В. Казько і інш. Мысленне і лексіка беларускіх пісьменнікаў пашыраецца паняццямі: „новае мысленне”, „плюралізм” і „кансенсус”, але і ў гэты час заставалася шмат праблемаў з друкаваннем па-грамадзянску смелых вершаў ці кніг. Чэргі на выданне твораў расцягваліся на некалькі дзесяцігоддзяў. Такая сітуацыя была вельмі песімістычнай і неперспектыўнай для пачаткоўцаў, маладых літаратараў.

У гэты час пачынаюць узнікаць розныя нефармальныя маладзёжныя клубы, аб’яднанні. Вядома, што напрыканцы 1986 года, восенню, маладыя літаратары аб’ядналіся ў групоўку, якая збірала моладзь з усіх рэгіёнаў Беларусі, прываблівала людзей, якія не былі абыякавыя да праблемаў беларуска-

моўнай літаратуры. Сустрэчы сяброў гэтай суполкі адбываліся спачатку у інтэрнаце Акадэміі Навук Беларусі ў Мінску, а іх ладзіў А. Бяляцкі. Пазней Таварыства існавала пры Саюзе пісьменнікаў у якасці Таварыства Маладых Літаратараў „Тутэйшыя".

Напачатку ўдзельнікі таварыства запрашалі на сустрэчы маладых літаратараў – пісьмова або вусна, сярод іх не было выпадковых людзей. Пазней, каб стаць сябрам таварыства, трэба было падаць заяву на імя старшыні таварыства, спіс літаратурных публікацый у рэспубліканскім друку, рукапіс, аўтабіяграфію, дзве рэкамендацыі ад сяброў Таварыства.

А. Глобус у адным з інтэрв'ю расказаў: „Мы не хацелі, каб на пасяджэннях і ўвогуле да нас прымазваліся людзі бяздарныя, неперспектыўныя". І таму, калі чалавек бяздарны, яму казалі: „Слухай, ты бяздарны, ідзі адсюль".

25 красавіка 1987 года на пасяджэнні адбылося абранне Кіраўніцтва Таварыства. Старшынёю стаў Анатоль Бяляцкі, намеснікамі былі: Віта Казлова і Сяргей Кавалёў. Адказным за паэзію быў абраны А. Сыс, за прозу – А. Глобус, за дзіцячую літаратуру – П. Васючэнка, за крытыку – С. Дубавец, за драматургію – У. Сцяпан, за выступленні – М. Талочка.

10 снежня 1987 года адбыўся першы літаратурны вечар Таварыства „Тутэйшыя". Падчас сустрэчы маладыя пісьменнікі рэпрэзентавалі сябе праз творы, паказвалі, чаго яны вартыя. Свае вершы чыталі У. Сіўчыкаў, А. Сыс, М. Шэлехаў, А. Глобус, С. Вераціла, В. Куртаніч, А. Дэбіш, Л. Сільнова, А. Бадак, М. Скобла; апавяданні – У. Сцяпан і М. Шайбак; быў прачытаны ўрывак з аповесці А. Федарэнкі і крытычны артыкул С. Кавалёва.

На вечарыне прысутнічалі і старэйшыя пісьменнікі: Янка Брыль, Васіль Вітка, Сяргей Грахоўскі, Станіслаў Шушкевіч, Уладзімір Някляеў і Янка Сіпакоў.

У газеце „Літаратура і Мастацтва" пасля сустрэчы „Тутэйшых" з'явіўся ананімны артыкул, які называўся „Маладыя трымаюць экзамен". У ім можна было прачытаць пра падзеі таго вечара. Пра гэтае спатканне пісаў яшчэ Яўген Лецка і Анатоль Казловіч – у маскоўскай „Литературной газете". У гэты час „Тутэйшым"спецыяльную анкету прысвяціў часопіс „Маладосць", часопіс „Нёман" запрасіў іх на круглы стол. Гэта выклікала дыскусію пра Таварыства, у якой узялі слова ўдзельнікі Таварыства і старэйшыя пісьменнікі, якія, як сцвярджае С. Кавалёў, хацелі атрымаць адказ на пытанні пра канфлікт пакаленняў.

Таварыства „Тутэйшыя" было ўтворанае з мэтай абараняць свае правы, свае погляды і перакананні, супрацьстаяць жалезнай іерархічнай структуры Саюза пісьменнікаў.

Назва „Тутэйныя", як сказаў С. Кавалёў, выклікала шмат спрэчак, якія датычыліся не значэння слова, а таго, што заўсёды трэба было тлумачыць людзям адкуль яна ўзялася.

А. Глобус і А. Сыс згодна сцвярджаюць, што назва іранічная. А. Глобус у сувязі з гэтым выказаў меркаванне, што трэба ўсведамляць сябе нацыяй, народам з культурай і мовай, а без таго людзі не маюць права называць сябе сапраўднымі беларусамі. А. Сыс тлумачыў, што назву „Тутэйшыя” яны ўзялі ў Янкі Купалы. Назва Таварыства – гэта выклік тым, хто лічыць сябе беларусамі, хоць па-сутнасці такімі сапраўды не з’яўляюцца. Усе ўдзельнікі Таварыства многа дыскутавалі наконт назвы. Яны хацелі так называцца, каб ужо сваёй назвай выклікаць да сябе ўвагу сумленных беларусаў. Вось як палемічна сказаў пра гэта А. Аркуш: „Беларусі пакуль няма, таму і беларусаў няма, ёсць толькі тутэйшыя, а мы іх чыстка”.

С. Дубавец стварыў маніфест „Тутэйшых”, які быў вынікам калектыўнага роздуму „тутэйшаўцаў” над лёсам і будучыняй беларускай літаратуры. Дакумент складаецца з чатырох частак і трыццаці двух тэзісаў. У першай частцы маніфеста дэкларуецца, што літаратура – гэта Бацькаўшчына, а пісьменнік з’яўляецца носьбітам нацыянальнага ідэалу. Такім ідэальным пісьменнікам, апошнім Прарокам, абаронцам беларускай мовы быў Уладзімір Караткевіч, і цяпер пісьменнікі павінны быць наступнікамі Караткевіча.

Маніфест „Тутэйшых” забараняў неапраўдна частага, банальнага ўжывання слоў: Беларусь, Бацькаўшчына, Радзіма, Айчына, Народ, маці, любоў, душа, сэрца, боль, мір, барацьба...

Гэтыя словы павінны ўжывацца выключна да месца, імі нельга раскідвацца як паўсядзённымі, звыклымі. Для „тутэйшаўцаў” маці замяніла сама мова, а вёску – сама Гісторыя.

Другая частка маніфеста – гэта заклік, каб „Тутэйшыя” дбалі пра нацыянальную школу, карысталіся беларускай мовай.

Маніфест аднаўляў, так званую „наркамаўку”, граматыку, прыняў тарашкевіцу і гэта сведчыла, што аўтар, які карыстаецца ёй, належыць да новага літаратурнага пакалення. Аднак не ўсе пісьменнікі друкуюць свае творы паводле старога правапісу.

Маніфест „Тутэйшых” утрымліваў кодэкс сапраўднага літаратара-патрыёта. Ён быў надрукаваны ўпершыню ў Польшчы, і існаваў у поўнай адпаведнасці са сваім функцыянальным прызначэннем.

У 1988 годзе выйшла першая кніжка Таварыства ў Бібліятэцы часопіса „Маладосць”. Гэты факт даваў надзею маладым пісьменнікам, што і яны змогуць выдаць свае творы. Аўтарамі першай кнігі Бібліятэкчі з’яўляліся сябры Таварыства, гэта быў зборнік паэзіі „...І надзея, і лёс, і ўспаміны” (кніга ўключала вершы самых маладых пісьменнікаў ад 17 да 30 гадоў). Пачаткоўцы пісалі пра Радзіму, Бацькаўшчыну (ці пра прыроду). Гэты зборнік быў не вельмі дасканалы, але дазволіў аўтарам крытычна паглядзець на свае творы, што ў сваю чаргу давала магчымасць зрабіць крок наперад.

У Бібліятэцы часопіса „Маладосць” кніга прозы „Жнівеньскі праспект” выйшла больш якаснай, чым кніга паэзіі. Творы сяброў Таварыства друкаваліся ў розных газетах, часопісах. У Таварыства не было свайго рэгулярнага выдання. С. Дубавец выдаў некалькі нумароў самаіранічнага выдання „Кантроль”, а значная частка твораў маладых пісьменнікаў з’яўлялася ў някляеўскай „Крыніцы”. У 1989 годзе выйшаў зборнік „Тутэйшыя”. Ён паказваў, чаго дасягнулі ўдзельнікі Таварыства, хоць у гэтае выданне трапілі выпадковыя, не заўсёды высокамастацкія творы. Там былі змешчаны: паэзія, проза, гістарычныя нарысы, пераклады з антычнай, старажытнакітайскай, эстонскай паэзіі.

Таварыства „Тутэйшыя” не было афіцыйна скасаванае, хаця ў канцы 1988 года маладыя літаратары скончылі сваю дзейнасць як літаратурная суполка. Таварыства аб’ядноўвала каля 60 чалавек, якія жывуць па ўсёй Беларусі. Не ўсе сябры Таварыства сталі пісьменнікамі, але ўжо сёння мы маем прозвішчы выдатных паэтаў, пісьменнікаў, драматургаў, крытыкаў – сяброў Таварыства, такіх як: Анатоль Сыс, Сяргей Дубавец, Адам Глобус, Алесь Бяляцкі, Сяргей Кавалёў, Міхась Шайбак, Андрэй Федарэнка і шмат іншых. Яны, дзякуючы амбітнасці і мастацкай актыўнасці, выяўлялі прыкметы новага мастацтва, новага пакалення. „Тутэйшаўцы” адмаўляліся ад традыцыйнага мімезісу, звярталіся да паказу інтымнага жыцця чалавека. Гэта найбольш выразна паказалі М. Клімковіч, У. Сцяпан, М. Шайбак, С. Адамовіч.

А. Сыс у сваіх творах увасабляў паняцці „мінулае”, „традыцыя”, „патрыятызм”, „вясковасць”. З другога боку маем А. Глобуса, які звяртаецца да „будучыні”, „наватарства”, „касмапалітызму”, „урбанізацыі”.

Для С. Дубаўца натхненнем становіцца канфлікт паміж старым і новым пакаленнем. Ён выяўляецца паэтам, празаікам, эсэістам і крытыкам, які стаў узорам для наступнага пакалення беларускіх крытыкаў.

За час існавання „Тутэйшых” развівалася беларуская драматургія і тэатр. У гэтым накірунку шмат зрабілі: літаратуразнаўца, крытык, драматург – Сяргей Кавалёў, а таксама крытык і літаратуразнаўца Пятро Васючэнка.

Сёння Таварыства „Тутэйшыя” - гэта не толькі літаратурная суполка, але цэлае пакаленне пісьменнікаў, якое сваімі творамі, кнігамі ўпісалася ў еўрапейскі кантэкст.

„Тутэйшыя” вызначалі выразную светапоглядную мадэль літаратуры і ўнеслі ў нацыянальную літаратуру пашырэнне яе змястоўных і жанравых межаў. „Тутэйшыя” стварылі мастацкую канцэпцыю пакалення, а гісторыя „Тутэйшых” яшчэ не скончылася, яна існуе і да нашага часу.

ЛІТАРАТУРА:
1. Аксана Бязлепкіна: *Разам і паасобку: Таварыства Тутэйшыя – гісторыя, асобы, жанры*, Мінск, 2003.
2. *Тутэйшыя – Творчасць сяброў Таварыства*, Мінск, 1989.
3. Ганна Кісліцына: *Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы*, Мінск, 2006.